**19.** Дадзены прыклады:

*1) на галінцы; 2) выразна прачыталі;*
*3) дзядуля расказаў казку.*

Выберыце толькі сказ.

**А)** усе прыклады – сказы. **Б)** няма сказа. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**20.** Выберыце з прапанаваных словы, у якіх націск падае на другі склад:

*1) снягір; 2) стрыж; 3) зязюля.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**21.** Некаторыя народныя казкі заканчваюцца выразам *“Вам казка, а мне абаранкаў вязка”*. Такі выраз з’яўляецца … .

**А)** зачынам. **Б)** самым напружаным момантам.
**В)** паўторам дзеяння. **Г)** характарыстыкай герояў. **Д)** канцоўкай.

---

**22.** Прачытайце ўважліва назвы:

*1) звер; 2) птушка; 3) дрэва.*

Суаднясіце назвы з малюнкамі:

*а)*  *б)*  *в)* 

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-а, 2-в, 3-б. **В)** 1-б , 2-в, 3-а.
**Г)** 1-в, 2-б, 3-а. **Д)** 1-в, 2-а, 3-б.

---

**23.** Хлопчык прыйшоў з рыбалкі і пахваліўся сябрам:

*“Сёння я бачыў цэлы … плотак”.*

Якое слова прапушчана?

**А)** статак. **Б)** чарга. **В)** табун. **Г)** касяк. **Д)** зграя.

---

**24.** Як называецца вязкі асадак мінеральных і арганічных рэчываў на дне вадаёмаў?

**А)** пясок. **Б)** іл. **В)** водарасць. **Г)** глеба. **Д)** гліна.

---


Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб’яднанне «Інтэлектуальныя спаборніцтвы «Конкурс»

220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/

Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 1. Тыраж 4700 экз. Мінск. 2026 г.


# Конкурс па беларускай мове і літаратуры
# «БУСЛІК-2026»

*Чацвер, 12 лютага 2026 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 24 балы;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (8 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 8 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 8 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 120, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–2 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 2 класа

**1.** Колькі слоў у сказе?

*Ялюблюсваюсям’ю.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

---

**2.** Колькі складоў у слове *ягады*?



**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

---

**3.** Прачытайце ўважліва народнае выслоўе:

*Рана ўстанеш – шмат зробіш.*

Колькі ўсяго слоў з літарай *ш*?

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**4.** Якая птушка ў народзе мае назву *“лясны барабаншчык”*?

**А)** сарока. **Б)** дзяцел. **В)** сойка. **Г)** сава. **Д)** дрозд.

**5.** Прачытайце назвы дрэў: *1) сасна; 2) асіна; 3) ясень.*

У якім слове ёсць дзве літары *с*?

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такога слова. **В)** у 1. **Г)** у 2. **Д)** у 3.

**6.** Выберыце з прапанаваных назоўнік мужчынскага роду:

*1) дом; 2) ваза; 3) рэха; 4) акно.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**7.** Дадзены прыклады:

*1) стол; 2) ліпа; 3) канапа; 4) гром.*

Якія словы абазначаюць прадмет?

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**8.** Прачытайце назвы кветак:

*1) ружа; 2) валошка; 3) ландыш.*

Суаднясіце іх з малюнкамі:



*а)*



*б)*



*в)*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-а, 2-в, 3-б. **В)** 1-б , 2-в, 3-а.
**Г)** 1-в, 2-б, 3-а. **Д)** 1-в, 2-а, 3-б.

**9.** Якую літару напішаце на месцы пропуску ў словах:

*1) ве..ер; 2) ак..ёр; 3) мес..а?*

**А)** д. **Б)** т. **В)** ч. **Г)** ц. **Д)** ш.

**10.** Вызначце з дадзеных словы, якія маюць адзін склад:

*1) вяз; 2) груша; 3) клён; 4) вярба.*

**А)** усе словы. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

**11.** Выберыце з прапанаваных словы, у якіх усе зычныя цвёрдыя:

*1) трава; 2) неба; 3) рака; 4) сцюжа.*

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**12.** Як называецца першы месяц зімы?

**А)** сакавік. **Б)** чэрвень. **В)** верасень. **Г)** снежань. **Д)** люты.

**13.** Дапоўніце сказ:

*Каб быць адукаваным, трэба добра … .*

**А)** спаць. **Б)** гуляць. **В)** гультаяваць.
**Г)** вучыцца. **Д)** не слухацца.

**14.** Дадзены назоўнікі:

*1) настаўнік; 2) мастак; 3) будаўнік.*

Падбярыце да іх патрэбныя дзеясловы:

*а) малюе; б) будуе; в) вучыць.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-а, 2-в, 3-б. **В)** 1-б , 2-в, 3-а.
**Г)** 1-в, 2-б, 3-а. **Д)** 1-в, 2-а, 3-б.

**15.** Якое слова з прапанаваных можа ўжывацца і як назоўнік, і як дзеяслоў:

*1) мыла; 2) стол; 3) каша?*

**А)** усе словы. **Б)** няма такога слова. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**16.** Адгадайце народную загадку:

*Зімой і летам адным цветам.*

**А)** бяроза. **Б)** яблыня. **В)** дуб. **Г)** елка. **Д)** вішня.

**17.** Дадзены прыклады:

*1) Міша; 2) Ніна; 3) Вера; 4) Алесь.*

Пастаўце імёны ў алфавітным парадку.

**А)** 1, 2, 3, 4. **Б)** 2, 3, 1, 4. **В)** 3, 4, 1, 2. **Г)** 4, 3, 2, 1. **Д)** 4, 3, 1, 2.

**18.** Прачытайце ўважліва радкі народнай пацешкі:



*Сарока-варона*
*Дзеткам кашу варыла.*
*На прыпечку студзіла.*

Падлічыце колькасць назоўнікаў у форме множнага ліку.

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.